5. Дорофеенко, М.Л. Городское ономастическое пространство: основные компоненты (на материале внутригородских названий белорусского и французского городов) / М.Л. Дорофеенко // Ученые записки УО «ВГУ имени П. М. Машерова». – 2020. – Т. 31. – С. 148–151. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/23531 (дата обращения: 17.01.2025).
6. Токарчук, С.М. Годонимы г. Бреста: общая характеристика, типизация и особенности пространственного распространения / С.М. Токарчук, Т.С. Полячок // Псковский регионологический журнал. – 2020. – № 2(42). – С.110–123.
7. Одинаев, Т.Н. Улицы г. Гродно (Республика Беларусь) и г. Термеза (Республика Узбекистан): принципы номинации / Т.Н. Одинаев // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2023. – Т. 68. – № 1. – С. 24–34.
8. BrestCITY.com: – URL: https://brestcity.com/blog/ulicy-bresta (дата обращения: 07.12.2024).
9. Сизова, Е.А. Лингвокультурологический анализ урбанонимов (на материале английского, русского и французского языков) / Е.А. Сизова // Дис. … канд. филол. наук: 10.02.20. – М.: МЛУ, 2005. – 202 с.
10. Стаселько, Е. Мотивы номинации внутригородских объектов в русскоязычной и англоязычной культурах (на материале годонимов Минска и Лондона) / Е. Стаселько // Мир языков: ракурс и перспектива: материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22 апреля 2013. – Минск: БГУ, 2013. − С.8–96.
11. Прищепа, М.М. Мотивы и принципы номинации линейных объектов городов Юго-Западной Англии / М.М. Прищепа // Ученые записки. – 2024. – Т. 39. – С. 151–155. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/44027 (дата обращения: 17.01.2025).

# МІКРАТАПАНІМІЯ БЕЛАРУСІ ЯК АБ’ЕКТ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

*В.Ю. Радзюль*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Адной з найважнейшых задач анамастыкі на сучасным этапе з’яўляецца збор, сістэматызацыя і навуковае апісанне найменш даследаванай катэгорыі ўласных імёнаў – мікратапонімаў. Неабходнасць вывучэння ўласных найменняў дробных геаграфічных аб’ектаў у першую чаргу абумоўлена экстралінгвістычнымі фактарамі: адсутнасцю пісьмовай фіксацыі мікратапанімічных адзінак, масавым знікненнем населеных пунктаў, зменай пакаленняў, носьбітаў анамастычнай інфармацыі. У адрозненне ад іншых онімаў мікратапонімы вылучаюцца зменлівасцю і няўстойлівасцю, што звязана са спецыфікай іх характару і функцый. Са стратай мікратапонімаў знікае закладзеная ў іх каштоўная гісторыка-культурная інфармацыя, што і вымагае асабліва пільнага стаўлення да такіх назваў з мэтай захавання іх для будучых пакаленняў. У мікратапонімах адлюстроўваюцца гісторыя і характар засялення пэўнай тэрыторыі, яе рэльеф, асаблівасці расліннага і жывёльнага свету, рэгіянальныя моўныя факты і архаічныя пласты традыцыйнай культуры.

Мэта артыкула – выявіць ступень вывучанасці мікратапонімаў у айчыннай і рускай лінгвістыцы.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання паслужылі навуковыя публікацыі беларускіх і расійскіх вучоных, прысвечаныя праблемам вывучэння мікратапаніміі. Асноўнымі метадамі, якія прымяняюцца ў дадзенай працы, з’яўляюцца апісальны і аналітычны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У анамастычнай літаратуры выкарыстоўваюцца розныя дэфініцыі паняцця *мікратапонім* (ад грэч. *μικρός* – ‘малы’ + *τόπος* – ‘месца’ + *ὄνομα* – ‘імя’, ‘назва’). Неаднастайнасць вызначэння гэтага разраду онімных адзінак абумоўлена тым, што розныя даследчыкі бяруць за аснову розныя прыкметы (памеры аб’екта, ступень яго вядомасці, прыроднае ці непрыроднае паходжанне, фіксаванасць і г.д.). Так, у «Слоўніку лінгвістычных тэрмінаў» П.У. Сцяцко, М.Ф. Гуліцкага і Л.А. Антанюк мікратапонімы тлумачацца як «назвы дробных геарафічных аб’ектаў» [13, с. 81]. Згодна з А.В. Суперанскай, «мікратапонімы – гэта індывідуальныя назвы невялікіх прыродных або штучна створаных аб’ектаў, якія звычайна адлюстроўваюць іх характар і ўласцівасці» [12, с. 48]. С. А. Папоў прапануе наступнае азначэнне тэрміна *мікратапонім*: «уласнае імя невялікага прыроднага фізіка-геаграфічнага або створанага чалавекам аб’екта, вядомасць якога не выходзіць за межы вузкага кола людзей, якія жывуць у адным месцы, і якое звычайна адлюстроўвае характар і ўласцівасці названага аб’екта» [9, с. 68]. Сучасныя даследчыкі часцей за ўсё

прытрымліваюцца азначэння, якое прапанавала Н.У. Падольская ў сваёй рабоце «Словарь русской ономастической терминологии»: «уласнае імя (часцей) прыроднага фізіка-геаграфічнага мікрааб'екта, (радзей) створанага чалавекам, якое мае вузкую сферу ўжывання: функцыянуе ў межах толькі мікратэрыторыі, вядома вузкаму колу людзей, што жывуць побач з мікрааб'ектам, якому даецца назва, у тым ліку мікрагідронім, мікраайконім, мікраааронім, мікрахаронім, назвы ўрочышч, гаспадарчых угоддзяў, мікразбудаванняў (калодзежаў, мастоў, будак, вышак, зімовішчаў, кардонаў, паляўнічых дамкоў і да т. п.» [8, с. 83].

Многія даследчыкі спрабуюць вызначыць межы паміж уласна тапонімамі і мікратапонімамі. Па меркаванні А.В. Суперанскай, мікратапонімы маюць падабенства з тапонімамі, якое «заключаецца ў тым, што 1) усе яны намінатыўныя, 2) усе яны з'яўляюцца ўласнымі імёнамі рэальна існуючых аб'ектаў, якія маюць, акрамя таго, і агульныя назвы, 3) усе яны прывязаныя да месца, 4) усе яны індывідуальныя» [11, с. 37]. На думку іншых вучоных, мікратапонімы істотна адрозніваюцца ад уласна тапонімаў. Л.А. Клімкова лічыць, што дыферэнцыяльнымі прыкметамі тапонімаў і мікратапонімаў з'яўляюцца не велічыня і статус аб'екта, а характар і дыяпазон функцыянавання імя. Даследчыца ўказвае на наступныя спецыфічныя рысы мікратапанімічных адзінак: абмежаваная сфера ўжывання, неафіцыйнасць, вузкі дыяпазон выкарыстання, малая ступень вядомасці, функцыянаванне на пэўнай тэрыторыі ва ўмовах вуснай камунікацыі пры адсутнасці пісьмовай замацаванасці [6, с. 104].

У айчынным мовазнаўстве даследаванні, у цэнтры ўвагі якіх знаходзіцца мікратапанімічны матэрыял, з'яўляюцца ў 60–70 гг. XX ст. Пачатак навуковым даследаванням па беларускай мікратапаніміі паклала дысертацыя Я.М. Адамовіча «Тапанімія і мікратапанімія Случчыны», у якой на матэрыяле 4800 мікратапонімаў, сабраных у некаторых раёнах Мінскай і Брэсцкай абласцей, даследчык паказвае навуковае значэнне і асаблівасці мікратапаніміі, праводзіць класіфікацыю мікратапанімічных адзінак на аснове іх тыпаў і спосабаў утварэння [1]. У 1971 годзе выйшла яго манаграфія «Мікратапанімічныя назвы», у якой знайшлі адлюстраванне вынікі даследавання, праведзенага ў дысертацыі.

Вывучэнню мікратапаніміі Стаўбцоўшчыны прысвечана дысертацыя Г.М. Прышчэпчык. Даследчыца разглядае прадмет, праблематыку і асноўныя напрамкі мікратапанімікі, а таксама вылучае словаўтваральныя сродкі і прадуктыўныя словаўтваральныя мадэлі мікратапонімаў указанага рэгіёна [10].

У работах В.М. Емельяновіч прадстаўлены структурна-семантычны аналіз мікратапонімаў паўночна-заходняй часткі Брэсцкай вобласці. Вучоная разглядае крыніцы паходжання мікратапонімаў, іх структурна-семантычныя асаблівасці, а таксама параўноўвае структурна-словаўтваральныя тыпы мікратапонімаў Пружанскага і Камянецкага раёнаў Брэсцкай вобласці і мікратапонімаў Слуцкага і Стаўбцоўскага раёнаў Мінскай вобласці [4].

Дысертацыйнае даследаванне, манаграфія і асобныя навуковыя артыкулы Г.А. Івановай прысвечаны ўстанаўленню паходжання і спосабаў утварэння мікратапанімічных адзінак Мазырскага Палесся. Даследчыцай вылучаюцца лексіка-семантычныя групы мікратапонімаў, найбольшая ўвага надаецца назвам, якія адлюстроўваюць прыродна-геаграфічныя паняцці і паняцці, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю палешукоў [12].

У дысертацыі В.А. Шклярыка даследавана мікратапанімчная сістэма Усходняга Палесся. На шырокім фактычным матэрыяле, які складае каля 30 тысяч найменняў, аўтар разглядае іх лексіка-семантычную класіфікацыю з улікам дыялектнага члянення

мясцовасці, паказвае, што мікратапанімія можа паслужыць крыніцай вывучэння мовы народа, яго этнаграфіі, гісторыі [14].

Такім чынам, толькі пяць дысертацыйных даследаванняў цалкам прысвечаны разгляду розных аспектаў мікратапаніміі Беларусі. Акрамя таго, існуе некалькі работ, у якіх мікратапанімічныя адзінкі з'яўляюцца дадатковай крыніцай даследавання. Так, у дысертацыі Н.А. Багамольнікавай у лексіка-семантычным і структурна-граматычных аспектах разглядаюцца мікрагідронімы Гомельшчыны ў басейне ракі Прыпяць: назвы сажалак, канаваў, крыніц, ручаёў, каналаў [3]. Т.М. Аліферчык у сваёй манаграфіі ўпершыню аналізуе айконімы і мікратапонімы Заходняга Палесся ў этналінгвістычным аспекце, вызначае асноўныя прынцыпы тапанімічнай намінацыі, што дазволіла рэканструяваць ландшафтную мадэль у тапаніміі заходнепалескага рэгіёна [2].

Акрамя дысертацыйных даследаванняў і манаграфій, у айчынным мовазнаўстве існуе шэраг прац, у якіх даследуюцца лексіка-семантычныя, структурныя асаблівасці мікратапонімаў асобных вёсак (М.С. Васілеўскі, Ф.Д. Клімчук, У.У. Барысюк, М.А. Даніловіч, В.А. Комар, і інш.). Асобныя артыкулы прысвечаны разгляду мікратапанімічных адзінак, матываваных геаграфічнай тэрміналогіяй, земляробчай лексікай, антрапонімамі, апелятыўнай лексікай (В. Баранчук, М.М. Карсакова, І.І. Бубновіч, С.С. Клундук, Н.Р. Якубук і інш.).

Што датычыцца лексікаграфічнай інвентарызацыі мікратапонімаў, то можна адзначыць недастатковую колькасць мікратапанімічных слоўнікаў, нягледзячы на тое, што менавіта слоўнікі выконваюць надзвычай важную сацыяльную функцыю: фіксуюць назапашаны за стагоддзі мікратапанімічны матэрыял, спрыяюць яго захаванню і перадачы наступным пакаленням. Адным з першых лексікаграфічных даведнікаў з'яўляецца «Мікратапанімія Беларусі. Матэрыялы», які ўключае звыш 9 тысяч назваў дробных геаграфічных аб'ектаў, сабраных у 1948–1972 гг. [7]. Найбольш поўна ў ім прадстаўлены мікратапонімы Брэсцкай вобласці, асобных раёнаў Мінскай і Гродзенскай абласцей. У пачатку ХХ ст. беларуская лексікаграфія папаўняецца новымі мікратапанімічнымі слоўнікамі: «Анамастычны слоўнік Магілёўшчыны», «Слоўнік мікратапонімаў Магілёўшчыны», «Анамастычны слоўнік Гродзеншчыны», «Микротопонимия Мозырского Полесья». Падборкі мікратапонімаў таксама сустракаюцца ў працах і публікацыях В.Л. Вярэніча, С.Н. Прача, А. П. Цыхуна.

Такім чынам, аналіз матэрыялаў па беларускай мікратапаніміцы паказаў, што ў айчынным мовазнаўстве існуе выразная дыспрапорцыя паміж прадстаўленасцю ў навуковых працах мікратапаніміі розных рэгіёнаў Беларусі. Так, у асноўным вывучана мікратапанімія тэрыторыі Палесся і невялікай часткі цэнтральнай Беларусі. Мікратапонімы Віцебскай вобласці апісаны і прадстаўлены ў лексікаграфічных крыніцах у найменшай ступені. Асобныя артыкулы прысвечаны разгляду мікратапонімаў Дзісеншчыны (М.Н. Крыўко), Пастаўскага (Н.Я. Лукашэвіч) і Бешанковіцкага (К.А. Зайцава) раёнаў. Між тым пытанне пісьмовай фіксацыі і ўсебаковага даследавання мікратапаніміі Віцебшчыны на сённяшні час з'яўляецца актуальным, таму што Беларускае Паазер'е з'яўляецца ўнікальным гісторыка-этнаграфічным рэгіёнам, у якім пражываюць носьбіты беларускіх дыялектаў з унікальнай духоўнай культурай і багатай народнай мовай. Комплексны лінгвістычны аналіз мікратапонімаў Беларускага Паазер'я мае навукова-тэарэтычнае і практычнае значэнне.

**Заключэнне.** Такім чынам, даследаванне мікратапаніміі Беларусі мае вялікае значэнне не толькі для лінгвістычнай навукі, але і для шырокага пазнання духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа. Мікратапонімы з'яўляюцца важнай крыніцай разнастайнай лінгвістычнай і экстралінгвістычнай інфармацыі і адносяцца да спецыфічнай часткі рэгіянальнай лексічнай сістэмы. Аднак праблемы рэгіянальнай мікратапанімікі як асаблівай галіны тапанімікі застаюцца недастаткова

распрацаванымі: у прыватнасці, вельмі мала спецыяльных даследаванняў, прысвечаных падрабязнаму разгляду мікратапаніміі Беларускага Паазер'я. У сілу асаблівасцей свайго існавання гэты моўны матэрыял можа знікнуць, таму надзвычай важна сабраць мікратапанімічны матэрыял, вывучыць асноўныя працэсы фарміравання намінацыйнага комплексу Віцебскага рэгіёна і правесці яго лексікаграфічнае апісанне.

1. Адамовіч, Я.М. Мікратапанімічныя назвы / Я.М. Адамовіч. – Мінск: Вышэйш. шк., 1971. – 112 с.
2. Аліферчык, Т.М. Тапанімія Заходняга Палесся: этналінгвістычны аспект / Т.М. Аліферчык. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 255 с.
3. Багамольнікава, Н.А. Гідранімія басейна ракі Прыпяць у межах Гомельшчыны: дыс. ... канд. філал. навук: 10.02.01 / Н.А. Багамольнікава. – Гомель, 1997. – 150 л.
4. Емельянович, В.М. Особенности микротопонимии Брестчины / В.М. Емельянович // Региональные особенности восточнославянских языков, литератур, фольклора и методы их изучения. – Гомель, 1985. – Ч. 1. – С. 66–68.
5. Иванова, А.А. Микротопонимия Мозырского Полесья / А.А. Иванова. – 2-е изд. – Мозырь: МГПУ, 2007. – 220 с.
6. Климкова, Л.А. Нижегородская микротопонимия в языковой картине мира: монография / Л.А. Климкова. – Арзамас: АГПИ, 2007. – 394 с.
7. Мікратапанімія Беларусі. Матэрыялы / АН БССР, Ін-т мовазнаўства; рэд.: М.В. Бірыла, Ю.Ф. Мацкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 328 с.
8. Подольская, Н.В. Словарь русской ономастической терминологии / Н.В. Подольская. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Наука, 1988. – 192 с.
9. Попов, С.А. Топонимика в системе лингвокраеведческих дисциплин / С.А. Попов // Проблемы литературного и лингвокраеведческого краеведения. – Орёл: Изд-во ОГУ, 2007. – С. 67–71.
10. Прищепчик, А.М. Микротопонимия Столбцовщины: автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.661 / А.М. Прищепчик; Ин-т языкознания им. Я. Коласа БАН. – Минск, 1970. –19 с.
11. Суперанская, А.В. Микротопонимия, макротопонимия и их отличие от собственно топонимии / А.В. Суперанская // Микротопонимия: Сборник исследований по микротопонимии. – М.: Изд-во Московского университета, 1967. – С. 31–38.
12. Суперанская, А.В. Что такое топонимика? Из истории географических названий / А.В. Суперанская. – 2-е. изд. – М.: Либроком, 2011. – 178 с.
13. Сцяцко, П.У. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П.У. Сцяцко, М.Ф. Гуліцкі, Л.А. Антанюк. – Мінск: Вышэйш. шк., 1990. – 222 с.
14. Шклярык, В.А. Мікратапанімія Усходняга Палесся: лінгвагеаграфічны і лексіка-семантычны аспекты: аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10.02.01 / В.А. Шклярык. – Мінск, 2017. – 24 с.

## ЛЕПЕЛЬЩИНА ЛИТЕРАТУРНАЯ В МЕМОРИАЛЬНОЙ ТОПОНИМИКЕ

*Т.П. Слесарева*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Статья написана в рамках кафедральной темы "Традыцыі і навацыі ў развіцці мовы і культуры Беларускага Паазер'я", № ДР 20210510 ад 05.04.2021 г. задання 6.1.08 "Беларуская мова: этналінгвістычны, сацыялінгвістычны і лінгвакультуралагічны аспекты даследавання" подпрограммы «Беларуская мова і літаратура» государственной программы научных исследований «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 годы с целью решения задачи составления онимической биографии населенных пунктов Белорусского Поозерья, в частности, Лепельского региона.

Как отмечает А. Ассман, «по всем признакам похоже, что вокруг понятия воспоминание складывается новая парадигма наук о культуре, благодаря которой разнообразнейшие феномены и области культуры – искусство и литература, политика и общество, религия и право – предстают в новом контексте» [1, с. 12]. Это привело к тому, что самостоятельным научным направлением современного гуманитарного знания стала проблематика памяти.

Внимание к памяти обусловлено также спецификой современной культуры, для которой характерно развитие информационных технологий, создающих новую базу хранения и трансляции артефактов культуры.

Одним из способов сохранения нашей памяти об истории и географии выступает мемориальная топонимика – научная дисциплина, занимающаяся многоплановым изучением мест, связанных с именем выдающегося деятеля культуры или со знаковым историческим событием.